# ...КУПІЦЬ МАСКУ Ў АПТЭЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У камерцыйнай аптэцы на галоўнай плошчы горада — Перамогі — сказалі, што масак няма. Калі прывязуць, будуць прадаваць па 2 рублі 10 капеек.

Дарогу перайшоў, трохі прайшоў — ты ўжо каля ўваходных дзвярэй «Белфармацыі». У дзвюх аптэках на Маскоўскім праспекце прапаноўвалі маскі па 1 рублі 62 капейкі. А ў трэцяй, якая знаходзіцца недалёка ад галоўнага паштамта, ужо паспелі прадаць за 1 рубель 16 капеек. Фармацэўт сказала, што доўга чакаць не давядзецца і тавар будзе каштаваць столькі ж, бо маскі мясцовай вытворчасці.

Дарэчы, паводле інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, у Беларусі маскі робяць сем вытворцаў. Штодня — звыш 100 тысяч штук, а на гандлёвых складах іх у наяўнасці больш за 1,5 мільёна. На сайце ведамства напісана: прадаюцца маскі паштучна (ад 17 капеек), упакоўкамі — па 3-5 штук (ад 58 капеек). Але ж у аптэках цэны не такія, як на афіцыйным сайце міністэрства. Канешне, інтарэс прадаўцоў ніхто не адмяняў, але...

У дзвюх камерцыйных аптэках розных сетак (ад адной да другой рукой падаць) цана масак была 1,56 і 1,42 рубля. Гэта танней, чым у «Белфармацыі».

На праспекце Чарняхоўскага ў дзяржаўнай аптэцы, якая працуе кругласутачна, каля дзвюх гадзін дня кошт масак быў 1,62 рубля. Што цікава, калі пазней тэлефанаваў туды ж, адказалі, што ёсць ужо і па 96 капеек — з завязкамі, а на гумках — па 1,41 рубля... Мо падвезлі? Ну дык і добра!

У адной з самых папулярных вялікіх крам Віцебска — «Грыне» — у камерцыйнай аптэцы маска каштавала 2,25 рубля. Работнік сказаў, што яна дарагая, бо ўнутры вата.




Фота носіць ілюстрацыйны характар.

На вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў у краме «Капеечка» маскі прадавалі па цане 1,25 рубля. Дарэчы, гэта адзінае на маім шляху месца, дзе папулярны на сёння тавар выставілі так, каб было відаць, і з цаной: наклеілі на шкло, недалёка ад касавага апарата.

Цікава: а як з маскамі ў глыбінцы?

У райцэнтры Лёзна і ў сельскіх населеных пунктах раёна няма праблем з «маскавым пытаннем». Маскі ў аптэках «Фармацыі» каштуюць 1,16 рубля. У Лёзне яшчэ ёсць аптэка недзяржаўнага канкурэнта, дзе пад вечар у чацвер маскі скончыліся, але мне паабяцалі, што доўга чакаць не давядзецца. Цана — 1,45 рубля.

**Юрый ДЗЕРКАЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама,** падкрэслівае, што маскі ў дастатковай колькасці ёсць ва ўсіх аптэках. Ніякіх праблем. Калі ў нейкай прыватнай няма, аўтару гэтых радкоў прапанавалі адразу інфармаваць «інстанцыі», каб тавар аператыўна прывезлі.

На сёння няма толькі танных аднаслойных масак, бо яны кітайскай вытворчасці, у нас у краіне іх не вырабляюць, растлумачыў Юрый Дзеркач. Яны выкарыстоўваюцца для выдачы ў пунктах пропуску, для даследаванняў, бо іх зручна хутка здымаць і выкідваць. У найбліжэйшы час, адзначыў суразмоўца, выраб такіх масак будзе распачаты і ў нас.

## УДАКЛАДНІЦЬ ПРАЗ ЗВАНОК

Што датычыцца сталіцы, то на сайце 103.by яшчэ раніцай значылася, што маскі можна набыць у 409 сталічных аптэках. Аднак, як параіў фармацэўт адной з камерцыйных аптэк, лепш карыстацца сайтам tabletka.by — там можна знайсці больш дакладную інфармацыю. А яшчэ лепш перастрахавацца, каб не губляць час, і ўдакладніць усё, што вас цікавіць, праз званок у пэўную аптэку.

Напрыклад, сярод 409 аптэк, якія значацца на сайце 103.by, шмат дзяржаўных. Пасля званкоў у некаторыя з іх высветлілася, што інфармацыя сапраўды не заўсёды супадае. Так, шматразовыя марлевыя маскі, якія каштуюць больш за рубель, былі ў патрэбнай колькасці ва ўсіх аптэках. У адной з іх фармацэўт адразу адзначыла, што «на рукі» яны прадаюць сама болей 10—20 штук. А вось аднаразовых масак, якія каштуюць 28 капеек і значацца на сайце, у наяўнасці не было. Ва ўсякім разе, у тых аптэках, што мы абзванілі.

Былі на сайце і прыватныя аптэкі, дзе на самай справе масак не аказалася. У адной з камерцыйных кругласутачных аптэк фармацэўт параіла звярнуцца ў дзяржаўную сетку.

— Калі ў нас з'явяцца маскі, я не ведаю, але вы заўсёды можаце іх знайсці ў дзяржаўных аптэках, туды прывоз ажыццяўляецца кожны дзень, — растлумачыла спецыяліст. — Аднаразовых там можа не быць, але заўсёды ёсць марлевыя, іх можна выкарыстоўваць некалькі разоў — пасля прымянення памыць і адпрасаваць.

Таксама маскі былі ў выпадковых камерцыйных аптэках, якіх на сайце не аказалася. На гарачай лініі адной з іх адзначылі, што аднаразовыя маскі сталі зноў паступаць, але цяпер іх цана вырасла і набліжаецца да цаны шматразовых. Дарэчы, часцей за ўсё ў камерцыйных аптэках маскі і так каштуюць больш, чым у дзяржаўных.

А вось на сайце tabletka.by значыцца 507 аптэк, дзе можна набыць медыцынскія маскі. У асартыменце прадстаўлены аднаразовыя трохслойныя (ад 24 капеек), шматразовыя чатырохслойныя (ад 1,02 рубля) і нават рэспіратары (ад 3,31 рубля). У пошуку тавары падзяляюцца не толькі на віды, але і ў залежнасці ад вытворцы. Зусім невялікую колькасць складаюць маскі расійскай вытворчасці — на сайце яны значацца толькі ў адной аптэцы. Рэспіратары ж (толькі з Расіі) — у трох.

Аднак, пазваніўшы, мы высветлілі, што рэспіратараў нідзе няма. Дзесьці паведамілі, што прывоз ажыццяўляецца кожны дзень і што прывязуць сёння, яшчэ дакладна невядома, калі, а дзесьці сказалі, што іх ужо не будзе, але праз некалькі гадзін павінны прывезці маскі. У адзінай аптэцы, дзе значацца маскі расійскай вытворчасці, не аказалася ўвогуле ніякіх. Фармацэўт адзначыла, што гэты від тавару заўсёды стаіць у заяўцы і яна спадзяецца, што маскі з'явяцца ў продажы назаўтра.

Ва ўсіх жа 503 астатніх аптэках на сайце значацца тавары 10 розных беларускіх кампаній. У дзяржаўнай сетцы шматразовыя маскі былі ва ўсіх аптэках, што мы абзванілі.

— Зранку былі аднаразовыя, але іх разабралі, шматразовыя ёсць, — паведамілі ў дзяржаўнай аптэцы. — Калі яны зноў з'явяцца, мы не можам сказаць: прывоз плануецца на наступным тыдні, але гарантыі, што прывязуць менавіта аднаразовыя маскі, няма.

Так, у некаторых камерцыйных аптэках, якія значацца на сайце tabletka.by, не было ніякіх масак. Сям-там фармацэўты спадзяваліся на прывоз у найбліжэйшы час. Пасля абеду сайт даў новыя звесткі, прапаноў стала больш. Але і попыт пакуль не меншае.

**Валерыя КІСЛАЯ,**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## Извещение об аукционе 24 апреля 2020 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44951 «Здание очистных сооружений» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-49718 «Участок железнодорожных путей № 1; № 6» |
|---|---|---|
| Номер лота | **1** | **2** |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Ю | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Э |
| Тип помещения | отдельно стоящее | отдельно стоящее |
| Общая площадь | 205,0 кв. м | 699,7 м |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 0,1879 | 0,3449 |
| Начальная цена продажи | 35 357,51 | 10 072,56 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка | 3 535,75 | 1 007,26 |
| Условия продажи | единовременный платеж | единовременный платеж |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка | здание одноэтажное, кирпичное, с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть). Резервуары для воды – 2 шт. Ввод в эксплуатацию – 1994 г. | участок железнодорожного пути № 1: - год постройки – 1971 г.; - ширина колеи – 1520 мм; - длина – 496,70 м. Участок железнодорожного пути № 6: - год постройки – 1971 г.; - ширина колеи – 1520 мм; - длина – 203,00 м |

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий |
|---|---|---|
| Номер лота | **3** | **4** |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У |
| Тип помещения | совмещенное с другим изолированным помещением | отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв.м) | 3482,1 | 1930,1 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 0,2209 | 0,3941 |
| Начальная цена продажи | 66 546,46 | 341 298,70 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка | 6 654,65 | 34 129,87 |
| Условия продажи | возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка | здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 м², помещение ремонтно-механического участка 294 м², помещение цеха доборных изделий 1456 м², пристройка 12 м², навес 24 м², градирня 33 м², два теневых навеса 7 м². Покрытие бетонное 1030 м². Ввод в эксплуатацию – 1970 г. |

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»** |
| **Продавец аукциона** | **Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»** |

**Аукцион состоится 24 апреля 2020 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале ОАО «ПКСИ».**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

2. ***Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 23 апреля 2020 г. включительно.***

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 23 апреля 2020 года включительно, тел. 8 0165-37-16-19, тел./факс 8 (0165) 37-16-66.**

**Контактный телефон 375-29-640-80-37.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «КУПАЛИНКА», Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Магазин «Кулинария»** (здание специализированное розничной торговли) общ. пл. 354 кв. м, инв. № 644/С-766, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, д. 34А. **Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина «Кулинария», общ. пл. 0,1363 га | |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 1 192 800,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, , получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | |
| Начало торгов: **11.00 22.04.2020**. Окончание торгов: **12.00 22.04.2020**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок** | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 20.04.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

Открытое акционерное общество
**Дорожно-строительный трест № 3**
**сообщает, что очередное общее собрание акционеров общества, намеченное на 25 марта 2020 года будет проведено в смешанной форме.**

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводится 25 марта 2020 года с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

УНП 700049607